К.М. Околович являлся потомственным почетным гражданином, священником православного вероисповедания, русским. Был избран депутатом IV Государственной думы от Минской губернии. Входил в фракцию Правых. Был челном комиссий по вероисповедательным вопросам, выступал против распространения сферы влияния католического вероисповедания в юго-западных губерниях Российской империи, выступал также против униатов и иудеев. Также входил в комиссии по народному образованию, по рабочему вопросу, о путях сообщения и библиотечной комиссии. После Февральской революции 1917 г. был в Петрограде, после служил в православных приходах в Латвии [1, с. 443–444].

В.С. Дрибинцев относился к потомственным почетным гражданам, происходил из семьи купцов-старообрядцев, был губернским секретарем, и себя воспринимал русским. Представитель в IV Государственной Думе от Могилевской губернии. Входил во фракцию «Союза 17 октября», а после ее раскола во фракцию Земцев-октябристов. Член Прогрессивного блока. Также был членом комиссий по народному образованию, местному самоуправлению, финансовой и старообрядческим делам [1, с. 181–182].

В заключении следует подчеркнуть еще раз подчеркнуть, что как правило представители почетных граждан в начале XX в., весьма пассивно принимали участие в политическом и общественно-культурном движении и как правило, которые не носили характер оппозиционности, в большей степени их деятельность распространялась в плоскости поддержки существующего строя и не было направлено на решение национального вопроса.

## Библиографические ссылки

1. Государственная Дума России: энциклопедия: в 2 т. / Государственная Дума Федерального собрания Российской Федерации [и др.]. – Москва: РОССПЭН, 2006. Т. 1: Государственная дума Российской империи, 1906 - 1917 / редколлегия: В. В. Шелохаев (ответственный редактор) [и др.]. —767 с.
2. Каханоўскі, А.Г. Ганаровыя грамадзяне ў саслоўна-карпаратыўнай арганізацыі беларускага грамадства ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / А.Г. Каханоўскі // Весн. Брэсц. ун-та. – Сер. 2. Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2016. – № 1. – С. 15–20.
3. Каханоўскі, А.Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А.Г. Каханоўскі; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск: БДУ, 2013. – 335 с.
4. Об установлении в состоянии городских обывателей нового сословия почетных граждан и о правах и преимуществах сего сословия, 10 апреля 1832 г., № 5284 // ПСЗРИ. Собр. 2-е: в 55 т. – Спб., 1833. – Т. 7. – Отд. 2. – С. 193–195.

**Яноўскі Алег Антонавіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

# ІДЭЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ ЯК ВЫЗНАЧАЛЬНЫ ФАКТАР СТВАРЭННЯ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

Год ад году ў нашым універсітэцкім асяроддзі то заціхаюць, то актывізуюцца меркаванні вакол, здаецца, даўно вызначанай даты «нараджэння» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Нават не аднойчы ўзнікалі і працягваюць узнікаюць спрэчкі наконт таго, якую ж усё-такі лічыць «самай» галоўнай з трох вядомых: 25 лютага 1919 г, 11 ліпеня 1921 г.

і 30 кастрычніка таго ж 1921 г. (у 2017 г. газета БДУ «Універсітэт» нават паспрабавала некалькімі публікацыямі паставіць «апошнюю кропку» у гэтых дыскусіях). І гэта тады, калі дзясяткі разоў ці то «грымелі» на рэспубліканскім і нават усесаюзным узроўнях юбілейныя мерапрыемствы з нагоды адзначэння менавіта 30 кастрычніка як дня «нараджэння», «заснавання» ці проста «пачатку дзейнасці» першага ўніверсітэта першай па-сапраўднаму беларускай дзяржаўнасці. Дзень 30 кастрычніка застаецца святочным днём для нашай карпарацыі (як, хацелася б думаць, і для ўсяго беларускага грамадства, улады) і на працягу 1991–2018 гадоў. Чаго там – гэтая дата зафіксаваная ў Статуце БДУ, які зацверджаны прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Вось чаму, на наш погляд, падобныя «інтэлектуальныя рухі» – даніна сучасным пераглядам традыцый і канстатацый, якія былі ўсталяваны і пераканаўча абгрунтаваны нашымі папярэднікамі, нашымі настаўнікамі і калегамі. У гэтым рэчышчы можна ўспрымаць і «векавыя юбілеі», якія ў апошні час гучна адзначылі некаторыя ВНУ краіны і якія выклікаюць толькі жаль у тых, хто хоць крыху ведае абставіны стварэння на беларускай зямлі сапраўдных вышэйшых навучальных устаноў. Можна лічыць гэтыя абставіны праяўленнем «неабальшавіцкіх» памкненняў у час глабальных грамадска-палітычных зрухаў і будавання новых падмуркаў нацыянальнай дзяржаўнасці. Такое не аднойчы дэманстравалі розныя інстытуцыі і асобныя іх прадстаўнікі ў першыя посткастрычніцкія часы, калі будавалася савецкая ўлада і ўсталёўваўся савецкі вобраз мыслення...

Гэты ўступ спатрэбіўся, каб звярнуць увагу на той факт, што якраз неабходнасць пабудовы пасля пераможнага 1917 г. зусім іншай па сваіх характарыстыках дзяржавы натуральна ўзрушвала спачатку пэўныя інтэлектуальныя колы, а потым гэтая ідэя захоплівала і ўсіх тых, хто не збіраўся пакідаць радзіму і павінен быў прыстасавацца да новых палітычных абставін. Тых, каго ўсё больш і больш захоплівала перспектыва мець «сваю» дзяржаву. Таму ўжо адразу пасля «Вялікага Кастрычніка» хтосьці ўстаў у шэрагі практычных будаўнікоў беларускай па духу і сутнасці дзяржавы, а хтосьці пачаў схіляцца, і далёка не адразу, да самой яе ідэі. Вось толькі спачатку не было нейкага адзінага разумення гэтай ідэі.

У тых умовах Беларускі ўніверсітэт стаў магчымым толькі як універсітэт дзяржаўны. А гэтая дзяржава была абвешчана Сацыялістычнай і Савецкай! Памкненні лідараў нацыянальнага руху 1917–1918 гг. стварыць і Народную Рэспубліку, і яе Беларускі Універсітэт былі агучаны і нават сталі ажыццяўляцца першыя практычныя мерапрыемствы. Але перамаглі тэорыя і практыка бальшавізму. Першы ўніверсітэт у Беларусі ствараўся пад парасонам цэнтральнай (маскоўскай) бальшавіцкай улады. Між тым яго сутнасць адразу ж напаўнялася нацыянальнымі характарыстыкамі.

Аб гэтай двойснасці сведчаць шматлікія факты. Літаральна можна браць амаль што любы дакумент першай паловы 1920-х гг. і цытаваць яго як доказ такога ўспрыняцця – Універсітэт і Беларускі, і Дзяржаўны! Гэтыя знешне простыя характарыстыкі менавіта ў першыя гады дзейнасці БДУ былі напоўнены як аб'ектыўнымі абставінамі, так і шчырым успрыняццем большасцю з тых, хто быў уключаны ў працэс стварэння і дзейнасці БДУ, неразрыўнай повязі дзяржаўнай формы і нацыянальна-беларускага зместу Універсітэту.

Звернемся да некаторых прыкладаў, дазваляючы сабе некаторыя цытаванні, без якіх цяжка абысціся, каб не страціць дух часу і не быць простым інтэрпрэтатарам слоў і думак сапраўдных стваральнікаў новай Беларусі.

Зразумела, найперш канстатацыя суадноснасці задач пабудовы першай беларускай дзяржавы і першага беларускага ўніверсітэта былі агучаны ў вядомым Дэкрэце ЦВК ССРБ ад 25 лютага 1919 г., які падпісалі два Аляксандры – старшыня ЦВК Аляксандр Фёдаравіч Мяснікоў і сакратар Аляксандр Мікалаевіч Антанікоўскі. У ім канстатавалася рашэнне «...адкрыць у г. Мінску Дяржаўны ўніверсітэт...» [1]. І гэта пры тым, адзначым, што сама дзяржава, якую толькі каля двух месяцаў назад дэкларавалі ў Смаленску, прадстаўляла сабой толькі пэўную тэрыторыю, ды пры тым зусім невялікую, а не гістарычна сфарміраваны арэал пражывання беларусаў. Гаварыць жа пра існаванне нейкіх устойлівых і эфектыўных органаў дзяржкіравання зусім не прыходзілася. Не не менш дэкляраванне неабходнасці стварэння, чаго б гэта не каштавала, свайго Беларускага ўніверсітэта было выражэннем перакананасці першай «хвалі» палітыкаў. Таму пацвярджэннем былі дакладныя крокі (і яны адразу сталі ажыццяўляцца) па вырашэнню арганізацыйных, кадравых, фінансавых і многіх іншых пытанняў.

Нельга не прызнаць, што пэўным чынам працэс стымуляваўся тым, што ідэя Беларускага ўніверсітэта працягвала быць адным са складнікаў палітычнай праграмы Беларускай Народнай Рэспублікі. Таму лідары ССРБ не маглі не браць у разлік гэты факт і са свайго боку праяўлялі актыўнасць і заклапочанасць у рэалізацыі задуманага праекту.

Вось толькі палітычныя рэаліі змяняліся хутка. Ужо 22 сакавіка 1919 г. на нарадзе ў Наркамасветы РСФСР той жа Мяснікоў у якасці прадстаўніка ўжо ЦВК Літоўска-Беларускай рэспублікі адстойваў ідэю Беларускага ўніверсітэта як універсітэта «Дзяржаўнага». А ў працяг намераў аб «інтэлектуалізацыі» беларусаў (дакладней – аб неабходнасці стварэння вышэйшых вучэбна-навуковых установ для рэалізацыі іх жыццёвых памкненняў на шляхах самаўдасканальвання) вёў гаворку аб адкрыцці ў Вільні «университета национального типа», у Віцебску – «Пролетарского университета и Народной консерватории», а ў Смаленску – проста «университета». Такім бачылі менавіта Беларускі ўніверсітэт і іншыя выступоўцы – навукоўцы і савецкія чыноўнікі ад адукацыі: Фёдар Турук, Вячаслаў Волгін, Вартан Тэр-Аганезаў і інш. Цікава, што ў пастанове гэтай нарады амаль кожны пункт падкрэсліваў, што ўніверсітэт у Мінску ствараецца менавіта як «дзяржаўны» – «Государственный университет Белоруссии» [2, арк. 3–4]. Такі прагматычны падыход (разлік на выключную фінансавую падтрымку савецкай дзяржавы, зразумела, расійскай) з боку ініцыятараў справы ў тых умовах быў адзіна магчымым. Тым больш, што ў межах «ЛітБела» як бы павінен быў існаваць толькі нейкі нейтральны «дзяржаўны» універсітэт.

І тым больш знамянальна тое, што калі арганізацыйны рух распачаўся, а ў Маскве стала зразумелай неабходнасць замацавання палітычнага «буфера» у беларускай яго дадзенасці, то ў хуткім часе змянілася і тэрміналагічнае суправаджэнне ўніверсітэцкай ідэі. На першае месца выйшла пазначэнне ўніверсітэта як «Беларускага», а потым ужо як

«Дзяржаўнага». Нельга не прымаць да ўліку і тое, што не апошнюю ролю ў развіцці ідэі Беларускага ўніверсітэта адыгралі тыя, хто ўвасабляў нацыянальныя беларускія парадыгмы палітычнага і грамадскага развіцця ў пертурбацыях рэвалюцыйнага часу. І да таго ж меў непасрэднае дачыненне да новай улады. Але ўвесь падрыхтоўчы перыяд (1919 г. – лета 1921 г.) у дакументах так і не было зафіксавана адзінага разумення: які ўніверсітэт усёж-такі ствараецца – «Дзяржаўны», «Беларускі» ці проста «Мінскі»? У сілу свайго разумення кожны карыстаўся найбольш «актуальным», палітычна прыдатным тэрмінам. Для тых жа, хто вырашыў пастунаць у новы ўніверсітэт, універсітэт «Дзяржаўны» быў больш аўтарытэтны, прываблівы і падобны на нядаўнія «Імператарскія» расійскія ўніверсітэты. Таму ў сваіх заявах перш-наперш і пісалі гэтае слова.

На жаль, рэальныя палітычныя і эканамічныя абставіны да лета 1920 г. не дазвалялі эфектыўна правесці задуманае ў жыццё. Тым не менш арганізацыйныя дзеянні калі не ў Мінску, які быў акупаваны польскімі войскамі, то ў Маскве не спыніліся. І тут нельга перааццаніць ролю кіраўніцтва маладой краіны. Аб гэтай неймаверна цяжкай працы можна прывесці дастаткова шмат фактаў. Абмяжуемся толькі згадкай таго, што менавіта па ініцыятыве першага ўраду ССРБ і пад агульным кіраўніцтвам першага складу рэспубліканскага Наркамасветы стала працаваць адмысловая камісія для падрыхтоўкі ўсіх неабходных умоў, разгортванню розных мерапрыемстваў па адчыненню ўніверсітэта.

Рэальная праца, скіраваная на канчатковы вынік, стала даваць пэўныя вынікі толькі са жніўня 1920 г., калі да яе падключыўся Наркамат асветы савецкай Расіі, які прыняў рашэнне аб узнаўленні дзейнасці Маскоўскай камісіі па стварэнню БДУ. У гэтую Камісію ўвайшлі У. І. Пічэта, Ф. Ф. Турук, Я. Ф. Карскі, Л. С. Мінор і інш. Адначасова актывізавала сваю працу камісія пры Мінскім аддзеле народнай асветы, якая імкнулася дзейнічаць у цесным кантакце з расійскім Наркаматам асветы. Цікавае назіранне: пад час доўгіх перамоў 11–18 жніўня 1920 г. членаў беларускай Камісіі з маскоўскімі калегамі (як зафіксавала адмысловая справаздача) зноў гаворка вялася толькі ці то аб «Минском университете», ці то яшчэ больш у паліткарэктнай фармуліроўцы – аб «университете в Минске» [3, арк. 17–22]. Без сумненняў, арганізатары рознага рангу яшчэ не адпрацавалі вербальны штамп, які б увасабіў галоўныя сутнасныя характарыстыкі ствараемага ўніверсітэта. Тым больш, што расійскім дзеячам Наркамата асветы было не вельмі зразумелым пазначэнне «Беларускі» як адлюстраванне інтэлектуальнага цэнтра нейкай асобнай дзяржавы. У лепшым выпадку, як выказаўся адзін з маскоўскіх «куратараў» універсітэцкага праекта Вартан Тыгранавіч Тэр-Аганезаў, незалежнасць Беларусі аб'яўлена, але пры захаванні «фактической связи ее с Россией» [3, арк. 18].

Агульнымі намаганнямі за кароткі час было зроблена зашмат спраў. Але толькі рашэнне Прэзідыўму ЦВК узноўленай ССРБ ад 18 красавіка 1921 г. на дзяржаўным узроўні канчаткова зафіксавала неабходнасць і наяўнасць рэальных магчымасцей адкрыцця ўніверсітэта ў Мінску. Універсітэта як «Беларускага Дзяржаўнага» [4, арк. 3]. Адначасова ў Маскве паскорыўся працэс пошуку выкладчыкаў і навукоўцаў для яго [2, арк. 1]. Пры ЦВК ССРБ была створана Універсітэцкая камісія для актывізацыі справы. У хуткм часе, 8 ліпеня, калегія Наркамасветы ССРБ зацвердзіла Праўленне

БДУ начале з Уладзімірам Іванавічам Пічэтай (разам з ім у рэальную справу ўключыліся Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі, Фёдар Фёдаравіч Турук, Марыя Якаўлеўна Фрумкіна).

Калі 11 ліпеня 1921 г. было наладжана ўрачыстае пасяджэнне з нагоды «Торжественного открытия» універсітэта ў азнаменаванне «годовщины освобождения столицы Белоруссии от белопольских войск», калі затым 30 кастрычніка гэтага ж году зноў адбыўся ўжо «Торжественный акт открытия», але на гэты раз каб заявіць аб рэальным распачынанні лекцый, практычных ды лабараторных заняткаў, то больш ніхто з прадстаўнікоў і ўлад, і прафесуры не эксперыментаваў з тэрміналагічным абазначэннем створанага «Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта»! [5, с. 20; 6]. Гэтая яго сутнасць і прызначэнне былі галоўнымі ў стагадовай плённай дзейнасці, яны абсалютна відавочны, абсалютна скіраваны на рэалізацыю і сёння.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. Звезда. 1919. 1 марта.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4. Воп. 1. Спр. 131.
3. НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1.
4. НАРБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 6.
5. Вестник Наркомпроса ССРБ. 1921. № 1.
6. Звезда. 1921. 30 октября.



**Янушевич Иван Иванович**

*Белорусский государственный университет (Минск, Беларусь)*


## ФОРМИРОВАНИЕ СОВЕТСКОЙ МОДЕЛИ ГОСУДАРСТВЕННО-ЦЕРКОВНЫХ ОТНОШЕНИЙ В БССР (1919–1941 гг.)

Начавшийся в 1917 г. процесс установления нового политического режима в России привел к кардинальным изменениям общественно-политической жизни. Государственное строительство Советской власти предполагало и решение церковного вопроса. Кроме лозунгов и программных заявлений какого-то плана действий у большевиков не было. Левоэкстремистской крыло партии во главе с Л. Троцким предполагало реализовать стремительные меры, сводившиеся фактически лишь к физическому уничтожению духовенства, ликвидации домов культов и насаждению новой якобы большевистской морали. Именно подобные мероприятия к 1919 г. показали, что одним кавалеристским наскоком вопрос не решить. Власть нуждалась в поддержке населения. А верующих в стране было абсолютное большинство и с их мнением необходимо было если не считаться, то хотя бы не идти на откровенный конфликт. Руководство Советской России должно было найти пути выхода страны из жесточайшего экономического кризиса. Обострять церковный вопрос в подобной ситуации было не рационально, но и не осуществлять мероприятий по уменьшению потенциала своего явного идеологического противника партия большевиков не мола. Задача построения безрелигиозного общества была тесно увязаны с иными пунктами программных установок по построению «светлого будущего» и созданию «нового человека». На территории Беларуси вопрос с